УЧОРА У МАСКВЕ, У 3-м ДОМЕ САВЕТАЎ АДЧЫНІЎСЯ IX ЗЬЕЗД УсеЛКСМ

Дзевятаму ўсесаюзнаму—баявое комсамольскае вітаньне!

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 12 (1281) ПЯТНІЦА, 16-га студзеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

ЧАШНІЦКАЯ КОМСАМОЛІЯ, РЫХТУЙСЯ ДА БАЯВОЙ ПРАВЕРКІ!

Бюро ЦК ЛКСМБ, абгаварыўшы пытаньне аб праваопортуністычным выступленьні на X усебеларускім зьезьдзе ЛКСМБ сэкратара Чашніцкага райкому комсамолу—Шурыца, пастанавіла: тав. Шурыца з працы сэкратара Чашніцкага РК ЛКСМБ зьняць і зрабіць агляд Чашніцкай організацыі па наступных галінах работы:

Удзел КСМ у гаспадарча-політычных кампаніях: у загатоўках, мобілізацыі сродкаў насельніцтва, перавыбарах с.-с., колектывізацыі сельскай гаспадаркі, выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну; рост організацыі і яго рэгуляваньне, удзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве, праца піонэрскай організацыі, становішча вайскова-фізкультурнай работы.

НА ХАДУ, ПА-УДАРНАМУ ПЕРАКЛЮЧЫЦЦА НА РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАСТАНОЎ X ЗЬЕЗДУ ЛКСМБ

Наперад--да новых перамог!

тымі днямі закончыў працу дзе- Усебеларускі зьезд Ленінскага самолу. Учора адчыніўся IX зьезд ЛКСМ. Што новае ўнёс у работу самольскай організацыі зьезд? З прышла комсамольская організа- Беларусі да зьездаў?

ьезд падагуліў амаль што за 3-х овы пэрыод праробленую працу самолу Беларусі—працу ў справе таньня за ажыцьцяўленьне генэ- ьнай лініі партыі на ўсіх вучаст- соцыялістычнага будаўніцтва.

часу IX Усебеларускага зьезду, самол Беларусі прайшоў адказь- шы па сваёй значнасьці шлях. У не за гэты пэрыод адбыліся ка- ныя эконамічныя і соцыяльныя кі. Рабочая кляса, пад кіраўніц- комуністычнай партыі, пасьля- на ажыцьцяўляючы лінію партыі ндустрыялізацыю краіны, дабіла- вялізарзейшых посьпехаў у галіне цыялістычнага будаўніцтва і пава- у асноўных бядняцка-серадняцкіх сялянства на шлях колектывіза- перайшоўшы ад політыкі абме- аньня і эксплёататарскіх тэндэнцый улацтва, да ліквідацыі кулацтва як сы на базе суцэльнай колекты- цыі.

этыя посьпехі дасягнуты партыяй непрымірымай барацьбе з клясавым агам упутры краіны і яго агенту- —правым опортунізмам, які зьяў- цца галоўнай небясьпекай, з „ле- мі" загібамі і прымірэнцтвам да іх.

Дзесяты зьезд ЛКСМБ, абгаварыў- пройдзены этап работы ЛКСМБ IX да X зьезду, адзначыў, што: юз у асноўным дабіўся павароту рам да соцыялістычнай рэконструк- . Яскравым паказчыкам работы СМБ, у пацьверджаньне гэтай кі, зьяўляецца тое, што комсамол арусі, як і ўвесь комсамол Савец- а Саюзу, зьявіўся ініцыятарам со- ялістычнага спаборніцтва і ўдар- ства, якое стала агульна рабочым быткам, адным з грунтоўнейшых адаў у справе ажыцьцяўленьня тых тэмпаў соцыялістычнага бу- ніцтва. Па Беларусі комсамольцы плены соц. спаборніцтвам і ўдар- твам на 83 проц., а ў некаторых цох гэты процант значна большы. СМБ зьяўляецца ініцыятарам пе- оду соц. спаборніцтва на вышэй- я яго формы: скразныя брыгады, ворчыя манэўры, батальёны энту- стых грамадзкія буксіры і г. д.

Комсамол аказаў вялікую дапамогу тыі ў справе колектывізацыі сель- й гаспадаркі ў барацьбе за лікві- ыю кулацтва як клясы на базе су- ьнай колектывізацыі. У час вясно- пасеўнай кампаніі комсамольскія ан зацыі прайшлі вялікую школу савай барацьбы, значна падвысілі ю клясавую баяздольнасьць.

эта ўсё сьведчыць аб значна ўз- шай політычнай актыўнасьці Са- і аб тым, што комсамол у асноў- м пасьпяхова працаваў над ажыць- леньнем генэральнай лініі партыі. днак, зьяўляючыся актыўным да- можнікам партыі ў барацьбе за ко- колгасны прыліў, за ўзмацненьне уючых колгасаў, комсамол вёскі яшчэ слаба выяўляе сябе ў ба- ьбе за організацыю працы ў кол- е, за ўзьняцьце працоўнай дысцып- ы, за плянаваньне гаспадаркі, за учыя галіны гаспадаркі, у барацьбе эзгаспадарнасьцю, за разгортвань- сыстэматычнай масавай працы з рацка-бядняцкай і серадняцкай мо- дзьдзю. Зьезд асабліва адзначыў, о „асноўнай задачай комсамоль- й організацыі Беларусі ў галіне цыялістычнай рэконструкцыі сель- й гаспадаркі павінна быць: бараць- за выкананьне пастаўленых пар- й задач у галіне далейшай колек- візацыі сельскай гаспадаркі, узмац- ьне існуючых саўгасаў і колгасаў, ынізацыя сельскай гаспадаркі, вы- эньне жывёлагадоўчай проблемы, бліва сьвінагадоўлі. як асноўнай проблемы на бліжэйшы час, мэліорацыя балот, як адзін з сродкаў пашырэньня соцыялістычнага сэктару на вёсцы ў вырашэньні проблемы тэхнічных культур,—сыравіннай базы для прамысловасьці".

Комсамол Беларусі, зьяўляючыся актыўным удзельнікам ва ўсіх галінах гаспадарчага будаўніцтва, мае шэраг посьпехаў і ў галіне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Гэтыя посьпехі—у мобілізацыі мас комсамольцаў на барацьбу з адхіленьнямі ад генэральнай лініі ў вырашэньні нацыянальнага пытаньня, па актыўны ўдзел у культурным будаўніцтве (шэфства над усеабучам, ліквідацыя няпісьменнасьці, высоўваньне пролетарскіх кадраў, правядзеньне работы сярод нацменшасьцяй; зроблены першыя крокі па аўладаньню тымі вучасткамі будаўніцтва, дзе комсамол асабліва адставаў — літаратура, мастацтва, кіно, тэатр, музыка і інш.

Усё-ж, ня гледзячы на гэта, зьезд адзначыў, што „тэмпы работы КСМ па ўдзелу ў нац. культбудаўніцтве яўна адстаюць, а па шэрагу вучасткаў не адпавядаюць тэмпам данай паласы разьвіцьця нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР". Таму неадкладная задача комсамольскай організацыі—дабіцца ў найхутчэйшы тэрмін зьдзейсьненьня павароту ўсёй сваёй масай да задачы будаўніцтва нацыянальнай культуры па форме і соцыялістычнай па зьместу—вядучы рашучую барацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай не паслабляючы барацьбы з беларускім контррэволюцыйным нацдэмократызмам і шовінізмамі розных колераў. Зьезд зьвярнуў увагу ўсёй організацыі на тое, што яна павінна дабіцца рашучага пералому ў правядзеньні важнейшай задачы нацкультурнага будаўніцтва: усеабучу і ліквідацыі няпісьменнасьці.

Разглядаючы пытаньне аб рабоце сярод дзяцей, зьезд адзначыў, што дасягнутыя посьпехі піонэр-організацыі зьяўляюцца недастатковымі ў параўнаньні з тымі запатрабаваньнямі, якія дыктуюцца сучаснымі задачамі партыі і комсамолу. Асноўнай работай сярод дзяцей павінна быць поўнае ўцягненьне ўсёй масы працоўнай дзетвары ў актыўную работу вытворча-грамадзкага жыцьця фабрыкі, колгасу і саўгасу, у барацьбе за пасьпяховае выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

Комсамол павінен пад кіраўніцтвам партыі і аўладаць вузлавымі вучасткамі будаўніцтва. У галіне падрыхтоўкі кадраў для індустрыі комсамол павінен працягваць барацьбу за падрыхтоўку кваліфікаванай рабочай сілы праз ФЗВ, пры адначасовым разгортваньні сеткі школ масавых профэсый, школ рабочага юнацтва і г. д. Разам з гэтым трэба памятаць, што большасьць вясковых ячэек ЛКСМБ недастаткова ўдзельнічаюць ва ўзмацненьні ўнутры-колгаснай вытворчасьці, у будаўніцтве саўгасаў, у організацыі МТС. Далейшая праца саюзу на вёсцы павінна быць падпарадкавана генэральнай установцы партыі—„да канца пяцігодкі колектывізацыя СССР павінна быць у асноўным закончана" (Сталін). У адпаведнасьці з гэтым, патрэбна ад кожнага вясковага комсамольца патрабаваць абавязковага ўступленьня ў колгас.

У барацьбе за клясавую чыстату сваіх шэрагаў комсамол пад кіраўніцтвам партыі прайшоў баявую школу комуністычнага выхаваньня. Ён разьбіў опортуністычныя „тэорыі" аб „асе аднячваньні саюзу", аб перавыхаваньні маладога кулака ў комсамоле і г. д. На паклёны Бутыркіных, Міхеевых, Целешавых, Шурыцаў, Пагодзіных і інш. аб крызісе саюзу, комсамол адказаў мобілізацыяй вопыту вытворчай актыўнасьці мас моладзі на выкананьне плянаў 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Нават на самым зьезьдзе паасобныя людзі, заблытаўшыся ў опортуністычнай твані, імкнуліся навязаць зьезду ў завуаляванай форме ўсім нам знаёмы енк Бутыркіна, Целешава і іншых аб крызісе актыўнасьці КСМ, аб катастрафічным становішчы активу і г. д.

Стаўшы ў позу „сыгналізатараў" сэкратар Чашніцкага РК—Шурыц хацеў давесьці організацыі, што комсамол вёскі ня можа спраўляцца з тымі задачамі, якія стаяць перад ім. Паклёпніцкія наскокі Шурыца сустрэлі рашучы аднадушны адпор дэлегатаў зьезду.

Той уздым, тая вышыня політычнай актыўнасьці, на ўзроўні якое праходзілі абмеркаваньні пытаньняў на зьезьдзе, зьяўляюцца яшчэ адным суровым прысудам опортуністым.

Пастановы зьезду павінны быць даведзены да ўсіх комсамольцаў, да шырокіх мас працоўнай моладзі, мобілізуючы масы комсамольскай моладзі на безадкладнае правядзеньне ў жыцьцё рашэньняў зьезду, на сапраўднае баявое аўладаньне вышынямі 3-га, рашаючага году пяцігодкі.

Прапрацоўка рашэньняў зьезду павінна прайсьці пад знакам непрымірымай барацьбы з ухіламі ад генэральнай лініі партыі, асабліва з правым, як галоўнай небясьпекай, рашуча змагаючыся з „левымі" загібамі, права-„лявацкім" блёкам, двурушніцтвам і прымірэнцтвам да іх.

Станем на абарону СССР

(Ліст з Парыжу)

Справа „Прампартыі", выкрыўшая французскіх імпэрыялістых, як застрэльшчыкаў нападу на Савецкі Саюз, выклікала выбух мацнейшага абурэньня ў масах дарослых рабочых і сярод рабочай моладзі. Шмат дзе, пад кіраўніцтвам комсамолу, былі організаваны шматтысячныя мітынгі і сходы протэсту. Рабочая моладзь Парыжу, Ліону, Марсэля і інш. буйных прамысловых гарадоў заявіла аб сваёй цьвёрдай гатоўнасьці абараняць СССР ад подлых нападаў імпэрыялістычных драпежнікаў.

У Гранж-о'Бэлль масавы сход рабочай моладзі, скліканы комсамолам у сувязі з процэсам „Прампартыі", закончыўся прывітальнымі выклікамі ў гонар СССР і Чырвонай арміі.

Рабочая моладзь гораду Рыкомары ў спэцыяльнай рэзолюцыі выказала свой протэст супроць спроб французскіх імпэрыялістых і іх агентаў з „Прампартыі" сарваць „агромністую работу, ажыцьцяўляемую пролетарыятам СССР па правядзеньню пяцігодкі".

У мясцовасьці Гільотэр група комсамольцаў прышла на фашысцкі сход, скліканы організацыяй „Уніон Франсэ". Адзін з комсамольцаў улез на трыбуну і, крыкнуўшы адтуль, што фашысцкія правадыры ашуканцы і распаўсюджваюць антысавецкія байкі, заклікаў прысутных на сходзе рабочых дапамагчы компартыі і комсамолу ў іх барацьбе за абарону Савецкага Саюзу.

Словы комсамольскага прамоўцы многія пакрылі гучнымі выклікамі адабрэньня.

Рабочыя аднадушна выказалі жаданьне ўсе свае сілы аддаць на абарону Савецкага Саюзу.

Да кампаніі, праводзімай комсамолам, далучыліся таксама шмат спортыўных організацый, ахапляючых вялікую колькасьць рабочай моладзі.

Цэнтральны орган французскага комсамолу—газэта „Авангард" друкуе шматлікія рэзолюцыі рабочых спортыўных організацый, протэстуючых супроць шкодніцкай работы „Прампартыі" і падрыхтоўкі нападу на СССР і цалкам ухваляючых прыгавор Вярхоўнага суда.

А. Раймон.

Мобілізаваць масы комсамольцаў і працоўнай моладзі на поўнае аўладаньне вышынямі 3-га рашаючага году пяцігодкі

Пастанова бюро Менгаркому ЛКСМБ ад 14-I—31 году

1. З мэтай азнаёміць комсамольскую організацыю і шырокія колы рабочай моладзі з рашэньнямі X Усебеларускага і IX Усесаюзнага зьезду ЛКСМ, якія павінны быць пакладзены ў аснову далейшай працы організацыі,—з 15-I—31 г. па 15-II—31 году абвясьціць ударны месячнік па вывучэньню гэтых рашэньняў.

2. Месячнік павінен праходзіць пад знакам поўнай мобілізацыі комсамолу і рабочай моладзі на справу ўзмацненьня дасягненьняў павароту організацыі тварам да політычна-гаспадарчых задач рэконструкцыйнага пэрыоду, пераключэньня гэтага павароту ў вышэйшыя формы, барацьбы за аўладаньне тэхнічнымі ведамі, удзелу ў рацыяналізацыі і рэконструкцыі нашых фабрык і заводаў, пры яшчэ больш бязьлітаснай барацьбе з праявамі правага опортунізму, як галоўнай небясьпекаю на даным этапе, рэшткамі контррэволюцыйнага троцкізму, права-„лявацкімі" двурушнікамі ў партыі і КСМ, тыпу Ломінадзэ, Сырцова, Шацкіна і інш. праяў нац. опортунізму ўсіх колераў і масьцей.

3. Вывучэньне матар'ялаў і рашэньняў зьездаў павінна быць скарыстана для далейшай працы па перабудове форм і мэтодаў працы організацыі па прынцыпу добраахвотнасьці, наладжваньня працы сэктароў, прыстасаваньня працы організацыі да паасобных груп моладзі (навічкоў, замужніх комсамолак і г. д.), уцягненьня ў практычную працу і вучобу новаўліўшыхся ў КСМ маладых рабочых і работніц у зьвязку з падрыхтоўкай да X і IX зьездаў ЛКСМ, далейшай працы па 100 проц. уцягненьню рабочай моладзі ў КСМ.

У час месячніку асаблівую ўвагу патрэбна аддаць пытаньням 100 проц. ахопу тэорэтычнай вучобай комсамолу і моладзі, з мацаваньню і палепшаньню якасьці ўсёй політ-выхаваўчай працы ў КСМ.

4. На працягу 1 дэкады ўсім колектывам і ячэйкам заслухаць даклады на тэму: Вынікі X-га Ўсебеларускага зьезду і далейшыя задачы організацыі ў наступным парадку:

1. Завод „Комунар" — дакладчык Фрумкіна, зав. „Энэргія"—Каўнацкі, зав. „Бальшавік"—Хэйман, шчотачная фабрыка—Умрэйка ф-ка „Кастрычнік"—Касьцюковіч, абутковая ф-ка—Гефэн, ДА—Анісаў, ф-ка „Беларуска"—Ліакумовіч, ф-ка „Крупскай"—Кроль.

Адказнасьць за скліканьне сходаў колектыву ўскладаецца на сэкратароў колектываў.

Усе астатнія колектывы зьбіраюцца па наступных кустах:

1. Цагельныя зав., Белдзяржбуд, Менбуд—адказны Вігдорчык, дакладчык—Харкоў.

2. Колектыў чыгункі, „Полымя Рэволюцыі" МШВ—адказны Тарлоўскі, дакладчык—Шымко.

3. 1-я Дзяржаўная друкарня імя Сталіна, друкарня „Зьвязда, БАН—дакладчык Старобінец.

4. Эльвод, „Ударнік", фабзавуч Мэталяаб'яднаньня, яч. маталістых, палата мер і вагі, ЦІП, ГЭТ—адказны Каплан, дакладчык—Мэсэль.

Сьпіртзавод, „Чырвоная Зорка", „Малочны завод" Хлебазавод. Калбасная ф-ка, 2-гі харчовы завод, „Комунарка", Менхладабойня — адказны Штэйн, дакладчык—Чартоў.

6. Хэмфармзавод, „Пролетары" „Чырвоны Хэмік", Тэкстыльная—адказны—Кізялевіч, дакладчык—Хазага.

7. Шчэціннная, абутковая майстэрня шорная, рымарная, шпалерная, лямцавая—дакладчык Вярбіцкі, адказны—Сапёр.

8. Белсампрамсаюз, працколектыў Утыль, ф-ка „8-га сакавіка", БСІКО—дакладчык Худыш, адказны—Зарэцкі

9. Саюз-транс, Аўтотранспорт, вулькан зацыйныя майстэрні — адказны Курбако, дакладчык—Дабрыйн.

10. Працасьвета, к—у ЛКСМБ рэд газэт, яч. Белдзяржкіно, Тэатр, ТРАМ БАН, Навукова дасьледчы інстытут, Дзяржбібліотэка—дакладчык Касьцюковіч, адказны—Мірэнбург.

11. ВСНГ, Дзяржплян, Гарсавет, Комгас, Банкаўскія ўстановы, Наркомфін, Ашчадкаса, Абкомтрэст, Нарсувязь, Міліцыя—дакладчык Харкоў, адказны—Галкоўскі.

12. Белкоопсаюз, МЦРК, групком харчавікоў, Нархач, Наркомгандаль—дакладчык Чартоў, адказны—Яфімаў

13. Саўгасы: Будзёны, Лекерта, Лошыца, „Вольная Праца", „Чырвоны агароднік", Наркомзем, Белколгасцэнтр, рабачком сельска-гаспадарчых рабочых—дакладчык Хэйман, адказны—Кагановіч.

14. Пэдфак, Наргас, Саўбуд, Хэмінстытут, Мэдінстытут, Будінстытут Электра-мэханічны інстытут—дакладчык Фрумкіна, адказны—Новік.

15. Політэхнікум, Белпэдтэхнікум Яўпэкгэхнікум, Польпэ тэхнікум, Профшкола будаўнікоў, Аб'яднаная профтэхшкола, Хэмпрофшкола, школа агнятрывалага будаўніцтва, Гідротэхнікум, дакладчык—Анісаў, адказны—Міхневіч.

16. Фізкультуртэхнікум, Музтэхнікум, Дашкольны тэхнікум, Аўтотэхнікум, Сельгастэхнікум, Тэхнікум сувязі, радыё курсы, курсы горных тэхнікаў, 2-хгадовыя пэдкурсы, мэдшкола профкурсы—дакладчык — Каўнацкі,—адказны—Лабадаеў.

5. 17-I—31 г. правесьці нараду культпропаў яч. па пытаньню прапрацоўкі вынікаў X-га Ўсебеларускага зьезду ЛКСМБ.

6. Для правядзеньня вынікаў месячніку і праверкі становішча прапрацоўкі рашэньняў зьездаў 25-II—г. г. правесьці гарадзкі палітбой па пытаньнях пастаноў X-га Усебеларускага зьезду ЛКСМБ і IX-га зьезду УсеЛКСМ. Прапанаваць тав. Фрумкінай і Кроль забясьпечыць сталую падрыхтоўку да політбою і забясьпечаньне колектываў належнымі кадрамі пропагандыстых і неабходнымі матар'яламі.

7. 1-II—31 г. заслухаць інформацыю на бюро ГК аб ходзе працы па прапрацоўцы рашэньняў зьезду і падрыхтоўцы да палітбою.

8. Адказнасьць за выкананьне усёй падрыхтоўчай працы да прапрацоўкі рашэньняў зьездаў і правядзеньня політбою ўскласьці на тав. Фрумкіна і Кроль.

Сэкратар гаркому ЛКСМБ Янковіч.

Усім райкомам ЛКСМБ

ЦК ЛКСМБ прапануе не пазьней 20-га студзеня б-г. накіраваць аддзелу падпіскі Бел. Аддзяленьня „Книгоцэнтра ОГИЗ'а (Менск, Ленінская 16) аформленыя заяўкі на шасьцітомнік твораў Леніна, паводле разьвёрсткі ЦК.

Заяўкі будуць прымацца толькі да 20-га студзеня

Заг. аддзелу тэорыі і пропаганды ЦК ЛКСМБ ПЭРЛІНА.

Нас клікалі шахты,—
Мы далі ў шахты.
Нас клікала мора—
Мы далі на мора,
Нас звалі ў акопы,
Мы далі ў акопы,
Усюды сваіх
маладых і здаровых

НА ГАСПАДАРЧЫМ ПЕРАКОПЕ

Разьбіць прагулы
ўшчэнт, на пух
Зьмясьці
нядбайства горы.
Мы вышлі
слухаць уважліва
пульс
кожнага матора
(П. БРОЎКА)

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і ЦК УсеЛКСМ, ЛКСМБ зьдзейсьніў лёзунг VIII зьезду УсеЛКСМ, у асноўн… дабіўся павароту тварам да вытворчасьці, дабіўся вялікіх посьпехаў у галіне выкананьня пяцігодкі ў чатыры га…

Лёзунг XIII зьезду выканалі

Учора пачаў сваю працу 9 зьезд УсеЛКСМ. Гэтымі днямі закончыў сваю работу X зьезд ЛКСМБ. Ленінскі комсамол Беларусі прышоў да зьездаў, як ніколі згуртаваны вакол комуністычнай партыі, адданы справе ажыцьцяўленьня яе генэральнай лініі.

Падвядзеньне комсамольскіх зьездаў супадае з пачаткам трэцяга, рашаючага году пяцігодкі. Трэці год пяцігодкі зьяўляецца тым годам, калі пролетарыят, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК, адмятаючы тых, хто ня верыць у творчыя здольнасьці пролетарыяту, заканчвае будаўніцтва фундаманту соцыялістычнай экономікі.

Прыведзеныя весткі і рапарты—лепшыя паказчыкі таго, што ня гледзячы на ўсе выступленьні правых ухілістых як у партыі, так і ў комсамоле, накштальт Бутыркіна і Целешава, якія імкнуліся давесьці наяўнасьць крызісу ў комсамольскай організацыі, комсамол на справе давёў сваю здольнасьць змагацца і організоўваць самыя шырокія колы рабочай моладзі на барацьбу за промфінплян, за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады.

Лічбы выкананьня плянаў ударнага кварталу сьведчаць аб тым, што комсамол зьдзейсьніў сапраўдны паварот тварам да вытворчасьці і што зараз на парадку дня стаіць пытаньне замацаваць гэты паварот, дабіцца ліквідацыі тых „вузкіх месц“ у паасобных галінах нашай працы.

9 зьезд УсеЛКСМ намеціць далейшыя шляхі практычнай дзейнасьці саюзу, па якіх комсамол павядзе далейшы наступ на фронце соцыялістычнага будаўніцтва.

Рапартуем зьездам лічбамі перамог

Паўтара гады таму назад па ініцыятыве комсамольскага колектыву швейнай фабрыкі „Кастрычнік“ былі організаваны маладзёжныя ўдарныя брыгады. Зараз на фабрыцы 83 ударныя брыгады ахопліваюць 1725 рабочых.

Організаваны батальён ударнікаўэнтузіястаў. Да канца пяцігодкі законтрактавалася 1225 рабочых.

Комсамольскі колектыў налічвае 320 комсамольцаў. Усе комсамольцы ахоплены ўдарнымі брыгадамі і законтрактаваны да канца пяцігодкі.

26 сьнежня, а 23 гадзіне 10 хвілін прамфінплян асобнага кварталу быў выкананы. За ўвесь ударны квартал прамфінплян выкананы на 108 проц.

У колектыве працуюць 4 брыгады па збору рызьзя і адна брыгада па барацьбе са стратамі. Комсамольскі колектыў узяў шэфства над зборам і рэалізацыяй рабочых прапаноў, на спэцыяльна організаваных вечарах сабрана 60 прапаноў.

У падарунак комсамольскім зьездам комсамольскі агрэгат пашыў звыш 1300 паліто, выпушчаных звыш пляну.

25 студзеня па ініцыятыве комсамольскага колектыву абдуўзецца конфэрэнцыя рабоча-сялянскай моладзі падшэфнага Пухавіцкага раёну па перадачы вопыту, па складаньню сустрэчнага прамфінпляну, па пытаньнях соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

Б. К.

Сталінцы ганаровае званьне апраўдалі...

Дзякуючы ўдарным тэмпам рабочыя машына-будаўнічага заводу цалкам выканалі програму ўдарнага кварталу. Сваёй працай яны дабіліся таго, што вярнулі заводу ганаровае званьне імя Сталіна.

Бабруйск. М. ПЕР.

Сустрэлі падрыхтаванымі

Рабочыя Магілёўскай швейнай фабрыкі на сваіх агульных сходах прапрацавалі прамфінплян на 1931 год. Гэтую прапрацоўку яны ўвязалі з вынясеньнем лепшых рацыяналізатарскіх прапаноў. Рабочы Цыбарэвіч унёс прапанову аб аўтоматычным пядзецыі лашкі швейнай машыны. Сконтруявана раскройная машына, якая па якасьці ня ўступае замежнай. Унесена шмат іншых прапаноў у галіне зьберажэньня электратоку, скарачэньня опэрацый і палепшаньня якасьці продукцыі. Ужо рэалізавана 33 прапановы.

Фабрычным організацыям наабходна зараз-жа прыступіць да організацыі сустрэчнага рацыяналізатарскага пляну.

ГАРЭЛАЎ.

Аб чым гавораць лічбы

Завод „Чырвоны Адраджэнец“ (Магілёў) з маленькай прыватнай майстэрні ператвараўся ў буйнае металюргічнае прадпрыемства.

Колектыў ЛКСМБ заводу, які налічвае 155 чал., конкрэтнымі справамі ажыцьцявіў паварот тварам да вытворчасьці, ахапіўшы ударніцтвам і соцспаборніцтвам 100 проц. комсамольцаў.

На заводзе і ў ФЗВ налічваецца 26 ударных брыгад, 3 бытавыя комуны і адна скразная брыгада в 150 ч. па вырабу сілосарэзак.

Першыя месяцы ўдарнага кварталу характарызаваліся наступнымі лічбамі; кастрычнік—89 проц., лістапад—64 проц., але ў сьнежні вялікім напружаньнем сіл і волі ўсяго колектыву мы выканалі прамфінплян на 147 проц., такім чынам плян ударнага кварталу па нашым заводзе выкананы на 101,9 проц.

Комсамольская ударная бры… замест 60 сілосарэзак выпусь… 120.

За час вытворчых манэўраў, … праводзіўся папярэдадзе X з… ду ЛКСМБ, організаваны тры … ныя брыгады і адна комуна. Гэ… самол уступіла 26 чалавек. Со… лістычнай кантрактацыяй да … пяцігодкі ахоплены усе ко… мольцы. У падарунак X зь… ЛКСМБ сіламі комсамольцаў, пр… ваўшых у непрацоўны час, вы… шчана адна сілосарэзка і адзін … матурны станок. Фабзаўцамі з… маставана тры трактары, упе… 16 рацыяналізатарскіх прапано… якіх 9 ўжо рэалізаваны.

6 комсамольцаў удар… вы… чаны на адказныя адміністр… ныя пасты. Прэміяваны 32 ко… мольцы.

БЮРО КОЛЕКТЫВУ ЛКСМ…

Вытворчая эстафэта без патрэбнай дапамогі

Комсамольскі колектыў фабрыкі „Спартак“ (Шклоў) для ліквідацыі прарыву прамфінпляну рашыў правесьці „вытворчую працоўную эстафэту імя чарговых комсамольскіх зьездаў“.

На сходах ячэек і рабочай моладзі былі распрацаваны маршруты эстафэты. Колектыў комсамолу зьвярнуўся за дапамогай да ўсіх партыйных і профсаюзных організацый фабрыкі, аднак, бюро партыйнага колектыву недаацаніла політычнага значэньня гэтага мерапрыемства і толькі праз 10 дзён пасьля старту эстафэты паставіла гэта пытаньне на бюро, але падышлі да яго формальна, абмежаваўшыся вылучэньнем у штаб прадстаўніка партколектыву.

У выніку—эстафэта яшчэ н… здабыткам усіх рабочых фабрыкі… асобныя адміністратары выкачу… супроць організацыі брыгад з мо…

Профсаюзныя і гаспадарчыя орг… зацыі праходзяць міма гаспада… эстафэты і лічаць яе толькі к… мольскай справай.

Неабходна пакласьці канец гэ… галаваціцкім адносінам да каш… най ініцыятывы комсамольскага ко… тыву.

Партыйная, профсаюзная і га… дарчыя організацыі павінны зара… ўключыцца ў правядзеньне эстаф… зрабіўшы яе асноўным дапаможн… у выкананьні прамфінпляну.

ПЧАЛ…

Дабіліся вялікіх посьпехаў

Гомельская абутковая фабрыка „Праца“ доўгі час ня выконвала прамфінпляну.

Пасьля зьмены ўсяго кіраўніцтва фабрыкі, якое ня здолела мобілізаваць масу на выкананьне прамфінпляну, на фабрыцы наступіў рэзкі пералом у працы. Калі раней соц. спаборніцтвам і ўдарніцтвам была ахоплена нязначная колькасьць комсамольцаў і рабочай моладзі, дык зараз 98 проц. рабочай моладзі ўдарнікі.

7 маладзёжных брыгад і 4 вытворчыя комуны далі магчымасьць у першы месяц з 60 проц. павялічыць выкананьне прамфінпляну да 98 проц.

На фабрыцы організавана скразная брыгада імя IX зьезду УсеЛКСМ.

Комсамольскі колектыў фабрыкі „Праца“ правёў вялікую працу ў сэнсе павароту тварам да вытворчасьці. Зараз трэба замацаваць конкрэтныя мерапрыемствы для пасьпяховага выкананьня прамфінпляну 3-га году пяцігодкі. Беразоўскі.

Узятыя абавязкі выканалі

На рымарнай фабрыцы імя 1-га мая (Менск) 4 месяцы таму назад быў організаваны комсамольскі цэх. Гэты цэх адразу паказаў прыклады як трэба працаваць бальшавіцкімі тэмпамі. У час вытворчых манэўраў комсамольскі цэх быў занесен на чырвоную дошку за перавыкананьне прамфінпляну і падняцьце працоўнай дысцыпліны.

Па цэлым шэрагу асортымэнтаў рабочыя комсамольскага цэху зьвізілі расцэнкі на 40-50 проц.

Прамфінплян ударнага квар… комсамольскі цэх выканаў за … калькі дзён раней тэрміну. Пр… фінплян ударнага кварталу на … рыцы выкананы на 104 проц.

Комсамольская організацыя … рыкі абяцала к X зьезду ЛК… выканаць прамфінплян 3-га, … шаючага году пяцігодкі. Сваё … цаньне мы выканалі.

Коцін…

НАС КЛІКАЛІ ШАХТЫ,—МЫ ДАЛІ Ў ШАХТЫ

Вугальнае сэрца краіны савецкаў давала перабоі. Данбас з-за недахопу рабочай сілы і нізкага ўзроўню мэханізацыі ня здолен быў даць патрэбнай колькасьці вугалю для нашай прамысловасьці.

Трывожна гулі гудкі.

Комсамол Беларусі—адзін з баявых атрадаў Чырвонаштандартнага Усесаюзнага Ленінскага комсамолу, мобілізаваў лепшых сваіх сыноў і кінуў іх на вугальны фронт. З усіх куткоў Беларусі: з Менску, Віцебску, Гомеля, Мозыра, з далёкіх беларускіх вёсак ішлі доўгія эшалёны туды,—у шахты Горлаўкі, Цітаўкі, на штурм вугалю, на ліквідацыю прарыву.

Ёсьць у нашых шэрагах і слабыя. Некаторыя ня вытрымалі агульнага націску, кінуліся ў паніку, дэзэртавалі з фронту. Але не драганулі шэрагі: ішлі ўсё ўперад і ўперад. Вугальны Перакоп у асноўным узяты.

З абурэньнем сустракалі комсамольцы Беларусі дэзэртыраў Донбасу. Ганьбаю і байкотам прымушалі вярнуцца і выправіць памылку. Хто ня ішоў, таго выкідалі з шэрагаў комсамолу, як здрадніка.

Кулакі дзейнічалі: агітавалі супроць паездкі на Донбас, імкнуліся сарваць мобілізацыю. Але комсамол, верны традыцыям партыі,—перамог. ЛКСМБ перавыканаў разьвёрстку, дадзеную ЦК УсеЛКСМ.

Сёньня мы зьмяшчаем два лісты комсамольцаў Беларусі, мобілізаваных на Донбас.

* * *

Дарагія таварышы!

Пасьля мобілізацыі нас на вугальны фронт, мы думалі, што вы аб нас зусім забыліся, але нарэшце атрымалі ваш ліст. Мы былі рады, што даведаліся аб тэй рабоце, якую комсамольская організацыя праводзіць пасьля нашага ад'езду.

У шэрагах мобілізаваных на вугальны фронт комсамольцаў, аказаліся трусы і дэзэртыры. Яны ўцяклі, не заглянуўшы ў шахты і гэтым самым аганьбілі нас і ўсіх мобілізаваных. Таму мы, комсамольцы Стара-Дарожскага раёну, просім райком такіх комсамольцаў як Сапляк і інш., якія паддаліся агітацыі клясавага ворага, выгнаць з нашых шэрагаў.

Мы, комсамольцы пакою 5, усе, як адзін, уступілі ва ўдарныя і скразныя брыгады. Працуем без прагулаў, а некаторыя і без выхадных дзён. **Тураў Адам** атрымаў за гэта прэмію. Комсамолец **Бахта Т.** высунуты дзесятнікам вучастку, а гэтымі днямі паедзе на паўторныя курсы ўрубавых машын.

Наша ячэйка УсеЛКСМ організавала штурмавы тыдзень з мэтай падняць вытворчасьць працы па здабычы вугалю. У гэты тыдзень комсамольцы працавалі без выхадных дзён. За два дні на шахце было здабыта 80 проц. вугалю. Мы думалі, што так пройдзе ўвесь тыдзень, але тэхнікі 5 і 4 вучастку зьявіліся на работу п'янымі і гэтым сарвалі здабычу на 12 проц.. Іх зьнялі з работы, выключылі з партыі, з саюзу.

Комсамол з усімі гэтымі ўчынкамі вядзе рашучую барацьбу.

Раскажам вам аб мэханізаванай здабычы вугалю. Зараз забойшчыкаў, якія рубілі вугаль абушком і абойным малатком, замяняе ўрубавая машынка, якая за 8 гадзін зробіць столькі, колькі 30 рабочых.

Гэтыя машыны раней выпускаліся выключна заграніцай, а зараз выпускаюцца ў нас, у Горлаўцы.

Пішэце аб тым, як жыве комсамол Беларусі. Не забывайце комсамольцаў вугальнага фронту.

З комсамольскім і шахцёрскім прывітаньнем **ЧАРОПКА, СЫЦЬКО, ТУРАЎ, БЯЗРУЧКА, ДЗЯМІДОВІЧ, НІКІФАРУК, БАХТЭ.**

* * *

Таварышы! Мы, комсамол… Самахвалаўшчыны, прачытаўшы… метку ў газэце „Чырвоная Зьме… за 20 сьнежня 1930 г. пад з… лоўкам „Дэзэртыру Чыстаму н… месца ў комсамоле“ ганьбім … комсамольцаў, якія спасавалі п… цяжкасьцямі на шляху выкана… тых задач, якія паставіла п… комсамолам комуністычная пар…

У адказ на гэта, мы, група … білізаваных на Донбас самахва… скіх комсамольцаў, у колькасьці … асоб, яшчэ больш узмоцнім ра… і прыкладзем усе сілы для лі… дацыі прарыву на вугальным ф… це. Мы ўсе, як адзін, перайшлі … баявыя тэмпы працы па ліквіда… вугальнага прарыву.

Даёш забой!

Група комсамольцаў, м… лізаваных на Донбас … подпісаў).

Лішчанскі раён,
канальня Цітава.

НА ПЕРАДАВЫЯ ПОЗЫЦЫІ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ

ЯЧЭЙКІ ЛКСМБ СЛАБА РАЗГАРНУЛІ РАБОТУ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ

Выкарыстаць справаздачна-перавыбарчую кампанію ў колгасах для масавай самаправеркі і ўзмацненьня тэмпаў работы па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы. Організаваць масы колгасьнікаў, беднякоў і серадьнякоў аднаасобнікаў на барацьбу з кулацтвам і яго агэнтурай—правымі і „левымі“ опортуністымі

Поўнасьцю і ў тэрмін выканаць заданьне партыі і ўраду

Сустрэнем ва ўсеўзброеньні бальшавіцкую сяўбу

105 мільёнаў гектараў пад яравыя пасевы. Палову гэтых пасеўных плошчаў павінны засеяць колгасы. Гэткія лічбы надыходзячай бальшавіцкай сяўбы. Яны съведчаць аб гіганцкім росьце сельскай гаспадаркі на социялістычнай аснове. У мінулым годзе пад яравымі пасевамі было 90 мільёнаў гектараў, і колгасы засявалі толькі 31 проц. плошчаў усяго яравога пасеву. Лічбы другой бальшавіцкай сяўбы—яскрава гавораць аб разгортваючым я сопыялістычным наступленьні, аб здабыўшыхся рашаючых зрухах у экономіцы краіны.

Даючы кантрольныя лічбы яравога пасеву на вясну 1931 году, партыя азначыла, што трэці год пяцігодкі павінен забясьпечыць рашучую перавагу социялістычных элемэнтаў над капіталістычнымі ў вёсцы, што ў 1931 годзе павінна быць колектывізавана ня менш паловы бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па ўсім СССР і закончана ў асноўным суцэльная колектывізацыя ў асноўных збожжавых раёнах краіны і на яе аснове ліквідацыя кулацтва як клясы.

Выкананьне гэтых грандыёзных задач ленінскі комсамол, як верны памочнік партыі, павінен праводзіць па-ударнаму, разгортваючы падрыхтоўку к вясьне.

Будаўніцтва савгасаў і машынна-трактарных станцый, умацаваньне колгасаў і організацыя новага прыліву мільёных бядняцкіх і серадняцкіх мас у колгасы, рашучая барацьба з опортунізмам і бязьлітаснае падаўленьне кулацкага супраціўленьня,—асноўнае, на чым павінна быць сконцэнтравана ўвага. З боку практычных мерапрыемстваў посьпех бальшавіцкай вясны забясьпечаць: своечасовасьць вывазкі ўгнаеньняў, ворыва і пасеву, выстарчальная колькасьць насеньня, падрыхтоўка і рамонт сельска-гаспадарчых прылад і забясьпечаньне цягавай сілай.

Вакол гэтых важнейшых задач комсамол павінен дапамагчы мобілізаваць увагу ўсіх савецкіх, профэсыйных і грамадзкіх організацый і ў першую чаргу самых шырокіх мас колгасьнікаў, батракоў, беднаты і серадьнякоў. Трэба дабіцца, каб баявыя пытаньні сяўбы былі абгавораны на вытворчых нарадах—колгасу, савгасу.

Першае—гэта пасеўплян. Ён павінен быць зусім конкрэтным, напісаным даступнай, зразумелай нават самому адсталому селяніну моваі. Гэты плян павінен быць даведзен не пазьней 1-га лютага да колгасу, вёскі, аднаасобнага двара. Да выпрацоўкі плянаў павінны быць прыцягнуты ўсе колгасьнікі, бедната і серадьнякі.

Уся работа па падрыхтоўцы да весновай сяўбы павінна разгортвацца на аснове соц. спаборніцтва, ударніцтва, выкарыстаньня, як выпрабаваных форм масавай работы, так і ўжываньня новых. Трэба ўтварыць шэраг ударных брыгад—па рамонту трактароў і с.-г. прылад па загатоўцы, пратручваньню і ачысткі насеньня, па вывазцы ўгнаеньняў і інш.

Гарадзкім комсамольцам трэба намеціць і безадкладна ажыцьцявіць практычныя меры дапамогі вёсцы, перш за ўсё колгасам, у вясновай сяўбе.

Кулацтва аказвае лютае супраціўленьне гэтым мерапрыемствам. Опортуністыя каркаюць аб „непасільнасьці“ намечаных плянаў. Ісьці да бальшавіцкай вясны трэба праз бязьлітаснае падаўленьне кулацкага супраціўленьня і рашучую барацьбу з опортунізмам. Жыцьцё разьбіла ўшчэнт усе ранейшыя прароцтвы опортуністых і цалком пацьвердзіла правільнасьць генэральнай лініі партыі. Гэткі-ж лёс спаткае опортунізм і на гэты раз.

Сяўба павінна прайсьці пад знакам непрымірымай барацьбы з правай небясьпекай, як галоўнай на даным этапе, рашучага адпору політыцы самацёку, „левацкім“ заскокам і прымірэнству да ўхілаў і опортуністычнай стаўкай на самацёк.

Падхопліваючы і організуючы ініцыятыву самых шырокіх бядняцка-серадняцкіх мас, устаўшых на шлях социялізму, партыя і яе верны памочнік—ленінскі комсамол, у трэці, рашаючы год, пяцігодкі завяршаюць пабудову фундаманту социялістычнай экономікі СССР.

А. Віч.

У Чэрвені зрываецца падрыхтоўка да вясны

ЧЭРВЕНЬ, 15. (Па тэлефону). Падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы ў раёне амаль яшчэ не распачалася. Шэраг колгасаў, як „Комінтэрн“, „Комунар“ і інш., ня ўзяўся за падрыхтоўку, — насеньне не абмалочана і не ачышчана, інвэнтар не рамантуецца і г. д.

У шэрагу сельсаветаў машыны па ачыстцы насеньня не працуюць. Колгасы ня маюць плянаў па сяўбе.

Вясковыя партыйныя і комсамольскія ячэйкі не мобілізавалі колгаснікаў і аднаасобнікаў на падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны.

Пост „Чырвонай Зьмены“
Міхась Ракіта.

Ня выконваюць заданьня ўраду

У Пухавіцкім раёне падрыхтоўка да вясеньняй пасеўкампаніі праходзіць дрэнна. Пляны вясеньняй пасеўкампаніі ня складзены і не даведзены да колгасаў і вёсак. РВК і райколгассаюз ня прымаюць ніякіх мер, каб забясьпечыць выкананьне дырэктывы ўраду аб давядзеньні да 1-га лютага плянаў вясеньняй пасеўкампаніі да колгасаў і вёсак.

Ачыстка збожжа па раёне яшчэ не пачата. Машыны не адрамантаваны, засыпка насенных фондаў праходзіць вельмі слаба. **Ліпніцкі.**

Слуцкі раён не гатовы да вясны

СЛУЦАК. (Ад нашага юнкора). Падрыхтоўка да другой бальшавіцкай вясны ў Слуцкім раёне яшчэ не пастаўлена на ўдарныя рэйкі. Пляны пасеўнай кампаніі даведзены толькі да сельсаветаў. Для выкананьня іх практычна нічога ня робіцца.

Асабліва дрэнна стаіць справа з падрыхтоўкай у аднаасобным сэктары. Крыху лепш у колгасах.

Амаль усе колгасы раёну абгаварылі пляны вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Колгасы „Першае Жніўня“, „Прамень Комуны“, Новабелічы, далі сустрэчныя пляны на 5-10 проц.

Большасьць сельсаветаў не давялі пляны пасеў-кампаніі да вёсак і гаспадарак.

Насенныя і страхавыя фонды як ў колгасах, так і ў індывідуальным сэктары ня створаны.

Ачыстка насеньня амаль яшчэ не распачата. Трэба ачысьціць па раёне 31448 цэнтнэраў, ачышчана толькі 130 цэнтнэраў.

Вапнаваньне і тарпаваньне глебы правалена.

Правальваецца і збор попелу. З рамонтам сельгаспадарчага інвэнтара таксама дрэнна.

Другая бальшавіцкая вясна ў раёне, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, павінна праходзіць пад лёзунгамі новага колгаснага прыліву, організацыі новых колгасаў.


На Случчыне да вясны намечана колектывізаваць 30 проц. усяе плошчы.

Але ў сучасны момант тэмпы работы па колектывізацыі рэзка зьнізіліся. Амаль ніхто гэтым пытаньнем ня цікавіцца.

У раёне існуе самацёк ў організацыі новага колгаснага прыліву.

Комсамольскія ячэйкі раёну не пераключыліся на сустрэчу другой бальшавіцкай вясны, на організацыю новага магутнага прыліву ў колгасы.

ПРЫБРІТАК.



НА ЗДЫМКУ: За ачысткай збожжа да вясеньняй сяўбы.

Не далі патрэбнага адпору кулацкім агэнтам

Нядаўна на пленуме Тураўскага райкому комсамолу стаяла пытаньне аб падрыхтоўцы да другой бальшавіцкай сяўбы. Раён у весну 1931 году павінен пашырыць пасеўную плошчу на 17,4 проц. Гэтая лічба вельмі рэальная ва ўмовах нашага раёну.

На пленуме, аднак, знашліся людзі, якія захацелі зьнізіць ўзятыя партыяй па пашырэньню пасеўнай плошчы ў раёне тэмпы. Сэкратар мястэчковай і колгаснай ячэйкі—член бюро РК ЛКСМБ Бяляй—выступіў з яўна кулацкай прамовай. Ён казаў, што пасеўную плошчу раёну нельга павялічыць быццам таму, што няма зямлі, што наогул заданьне надта вялікае.

І гэта ў той час, калі бюро і пленум РК КП(б)Б падкрэсьлілі, што пашырэньне пасеўнай плошчы Тураўскага сельсавету магчымая рэч.

За гэтым кулацкім сьпеваком выступіла сэкратар Рычаўскай ячэйкі ЛКСМБ і член бюро РК КСМ—Высоцкая.

Яна таксама сказала, што лічба аб пашырэньні пасеўнай плошчы ў Рычаўскім сельсавеце зусім нерэальная, што райземчастка гэтыя лічбы ўзяла са столі, а таму іх выканаць нельга. Яна настойвала на тым, каб скараціць заданьне аб пашырэньні пасеўнай плошчы, матывуючы так:

„Сяляне (чытай кулацка-заможныя гаспадаркі) кажуць: мы плошчу пашыраць ня будзем, бо тады дадуць яшчэ больш падатак і задушаць загатоўкамі“.

Аднак яўныя права-опортуністычныя выступленьні Высоцкай і Бяляя не атрымалі рашучага адпору з боку выступаўшага сэкратара РК ЛКСМБ т. Шапіра. Ён толькі крыху закрануў выступленьні кулацкіх агэнтаў і ацаніў іх як двурушніцкія. Старшыня конфліктнай камісіі РК КСМ—член партыі Фазоўскі таксама прымірэнча аднёсься да выступленьня Высоцкай і Бяляя: „яны ня думалі так гаварыць і так не гаварылі“.

І толькі прадстаўнік райкому КП(б)Б, тав. Макіенка, верна ахарактарызаваў выступленьне Высоцкай і Бяляя, як права—опортуністычнае.

Высоцкая і Бяляй свае памылкі ня прызналі, аднак пленум ня даў ім рашучага адпору і абмежаваўся толькі тым, што запрапанаваў Высоцкай выканаць вызначаныя сельсаветам кантрольныя лічбы.

Бяляй і Высоцкая павінны атрымаць па заслугах.

Пост „Чырвонай Зьмены“
МІХАСЬ

ДАЦЬ УДАРНЫ РАЗГОН БАЯВОЙ РАБОЦЕ

Шэраг колгасаў і комсамольскіх ячэек Буда-Кашалеўскага раёну шырока разгарнулі работу па падрыхтоўцы да вясновай сяўбы. Ячэйка колгасу „Пролетары“ і інш. па-баявому падрыхтоваюцца да другой бальшавіцкай вясны, падаюць прыклады самаадданай барацьбы за сапраўдную падрыхтоўку да сяўбы.

Комсамольская ячэйка колгасу „Пролетары“ склала плян конкрэтных дзеяньняў на час падрыхтоўкі і правядзеньня вясеньняй пасеўкампаніі, абгаварыла гэты плян сярод комсамольцаў, моладзі і з праўленьнем колгасу. Вакол высунутых плянам задач мобілізаваны шырокія колы колгаснай моладзі. Ячэйка сумесна з праўленьнем колгасу склала камісію, у задачу якое ўваходзіць работа па мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў колгасу, падрыхтоўка сельска-гаспадарчага інвэнтара і заканчэньне рамонту ўсіх сельска-гаспадарчых машын і прылад да 15-га студзеня.

Усю работу па падрыхтоўцы да вясновай сяўбы ячэйка цесна ўвязала з організацыяй новага прыліву ў колгасы. Ячэйка і праўленьне колгасу організавалі вярбовачныя групы з колгасьнікаў і моладзі, якія праводзяць па вёсках шырокую масавую работу сярод аднаасобнікаў. У колгас „Пролетары“ за апошнія тыдні ўступіла ўжо каля 30 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У колгасе „Трактарысты“ таксама па—ўдарнаму рыхтуюцца да правядзеньня вясеньняй сяўбы. Комсамольская ячэйка колгасу, абгаварыўшы на сваім сходзе гэта пытаньне, організавала брыгады па дапамозе колгасу ў правядзеньні падрыхтоўкі да сяўбы, па ачыстцы збожжа, рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара, організацыі працы і падрыхтоўцы цягавай сілы к вясеньняй сяўбе.

Разам з гэтым комсамольцы, пад кіраўніцтвам комуністых, разгарнулі работу па вярбоўцы новых членаў у колгас, куды ўступіла ўжо 9 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Ячэйка вядзе рашучую барацьбу з кулацтвам, якое ўсялякімі спробам імкнецца перашкодзіць падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы і знутры ўз рваць гаспадарчую моц колгасу. Комсамольская ячэйка дала рашучы адпор кулакам і іх агентам, якія было пралезьлі ў колгас „Трактарысты“. У колгасе організаваны моцны батрацка-бядняцкі актыў, які задае тон у яго рабоце.

Адзначаючы дадатныя бакі, нельга прамінуць таго факту, што гэтыя прыкладныя ўзоры падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы не зьяўляюцца дасягненьнем усёй організацыі. Шэраг комсамольскіх ячэек яшчэ не пераключыўся на падрыхтоўку да правядзеньня другой бальшавіцкай вясны. У райкоме і шэрагу комсамольскіх ячэек ёсьць шкодны настрой, што рана „яшчэ гаварыць аб падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы“ з-за гэтага райком комсамолу яшчэ не абгаварыў на пленуме пытаньня аб падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы. Большасьць ячэек раёну бязьдзейнічае.

Такія буйныя ячэйкі, як Рагінская, Інтэрнацыянальная. Буда-Кашалеўская і інш. стаяць у глыбокім тыле гэтай работы. Патрэбна адзначыць, што партыйныя ячэйкі недастаткова кіруюць работай комсамольскіх ячэек у галіне падрыхтоўкі да вясеньняй сяўбы.

Прыклады ўдалай работы паасобных ячэек у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы неабходна перанесьці ў практыку работы ўсіх комсамольскіх ячэек раёну. Трэба разгарнуць рашучую барацьбу з абломаўшчынай і па-сапраўднаму, ва ўсеўзброеньні сустрэць другую бальшавіцкую вясну.

Комсамолія Буда-Кашалеўскага раёну павінна зараз-жа ўлічыць свае памылкі і даць ударны разгон баявой рабоце, бальшавіцкімі тэмпамі забясьпечыць выкананьне задач, якія стаяць перад другой бальшавіцкай вясной.

Брыгада „ЧЗ“ С. і К.

Комсамольская ячэйка—у баку

Колгас „Чырвоная Зорка“, Любаньскага раёну, яшчэ не распачаў падрыхтоўчае працы да сустрэчы вясеньняй пасеўкампаніі: машыны і сельска-гаспадарчы інвэнтар не рамантуюцца, попел ня зьбіраецца, насеньне не ачышчаецца. Комсамольская ячэйка таксама бязьдзейнічае ў гэтым напрамку.

БУРДА

РАБОЧЫЯ ХЭМІЧНАГА ЗАВОДУ ВАРШАВЫ ЗАБАСТАВАЛІ

У турмы кідаюцца „бунтары супроць польскай дзяржавы“

Працоўнае насельніцтва выступае супроць падрыхтоўкі фашыстых да вайны з СССР

Забаставаў варшаўскі газавы завод

ВАРШАВА, 14. У зьвязку са зьніжэньнем заработнай платы, 14-га студзеня забаставаў варшаўскі газавы завод. Калі перагаворы скончацца бяз вынікаў, пагражаюць забастоўкай таксама і рабочыя трамваяў і гарадзкіх тэатраў.

Пэпээсаўскі профсаюз і профсаюз яваравушчыкаў узмоцнена імкнуцца папярэдзіць забастоўку.

Нацыянальны і соцыяльны ўціск у Польшчы

ВАРШАВА, 14. Падсудныя дэпутаты беларускага клюбу „Змаганьне“ скарысталі свае апошнія словы на віленскім процэсе, каб выступіць з політычнымі прамовамі.

Дэпутаты гаварылі аб нацыянальным і соцыяльным уціску ў Польшчы, аб посьпехах соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Пасьля абвяшчэньня прысуду, падсудныя наладзілі ў залі суда бурную дэманстрацыю, але паліцыя вывела іх з залі.

Выганяюць на шарваркі

(М. Добратыч, Тарас. пас.— Зах. Беларусь)

Фашысцкая ўлада ліхманкава будуе шосэ ўздоўж граніцы саветаў. Працоўных сялян цэлымі вёскамі з коньмі выганяюць на бясплатныя адработкі на 3-4 дні ў тыдзень, як на паншчыну—вазіць каменьне, пясок, капаць равы і г. д. Гэтыя бясплатныя адработкі для ваенных мэтаў па-польску завуцца шарваркі.

У нашым мястэчку выганяюць на гэтыя шарваркі толькі працоўных, а асаднікі, кулакі ад гэтых павіннасьцяй вызвалены зусім. Калі бядняк ці серадняк селянін мае каня дык ён павінен вывесьці, напрыклад, 6 мэтраў цэмэнту. Працоўныя сяляне выступілі супроць гэтага прыгону дзеля падрыхтоўкі вайны і, наперакор забароне ўлады, сабралі сход, дзе ўсе, як адзін, пастанавілі скасаваць шарваркі і адмовіліся іх выконваць.

Такім парадкам, працоўная моладзь нашага раёну і далей пад кіраўніцтвам компартыі і комсамолу, будзе весьці барацьбу супроць падрыхтоўкі вайны.

„Кажы,—мусіць бацька бальшавік“

(Ліст з Тараспольскага раёну, Заходняя Беларусь)

Большасьць насельніцтва ў нас—украінцы. Школы на роднай мове нам не даюць. Вось ужо некалькі год, як мы дабіваемся школы на роднай мове, некалькі раз складалі сотні подпісаў на заявах, каб адкрылі, але ўсё дарма. За тое, што дабіваліся школы на роднай мове, 8 чалавек у нас па сёньнешні дзень сядзяць у турме, бо іх называюць „зачыншчыкамі“ бунту супроць польскай дзяржавы.

Наперакор жаданьням прац. насельніцтва ўведзена польская школа. У гэтую школу заганяюць дзяцей прымусам, а хто ня ідзе—штрафуюць, цягаюць у паліцыю і нават садзяць у турму, як „сабатажнікаў“ Польшчы. У панскую польскую школу прыслалі папа, які прыходзіць некалькі раз на тыдзень і туманіць дзяцей нябеснымі цудамі, страшыць загробным жыцьцём і навучае, як трэба быць „лёяльнымі“ да „панства“.

Хто ня ўмее жагнацца (а некаторыя дзеці ня толькі ня хочуць, але і сьмяюцца з гэтага), таго караюць. Поп ударыў па твары аднаго вучня так, што той самлеў і абліўся крывёю. Поп страшыць дзяцей бальшавікамі і б'е іх кожны раз ламантоўкай на ўсю школу:—„Кажы,—мусіць бацька бальшавік“.

Дзеці раней зусім не ведалі, што такое „бальшавік“, толькі чулі аб іх. А цяпер усё больш пазнаюць, усё больш імкнуцца бліжэй да бальшавікоў, організуюцца ў піонэрскія атрады і комсамольскія ячэйкі.

У нашым мястэчку польская школа. Самае цяжкае для вучняў—гэта ўвядзеньне прымусовага ваеннага спорту і ваенных заняткаў. У гэты час асабліва муштруюць і зьдзекуюцца над дзецьмі, навучаюць, як трэба „абараняць“ Польшчу ад бальшавікоў. Настаўнік заўсёды задае пытаньне: „што трэба рабіць з бальшавікамі, якія не даюць нам дайсьці да дабрабыту“. Калі вучань не адкажа, што трэба бальшавікоў рэзаць, дык яму выдумляюць розныя кары: павідаюць без абеду, ставяць каленамі на гарох і г. д. Вось як рыхтуюць вучняў на вайну супроць СССР.

Але вучні ня надта паддаюцца фашызацыі і мілітарызацыі, а організуюцца выступаць супроць іх пад кіраўніцтвам комсамолу. Ёсьць вучні, што зусім ужо „адмовіліся“ ад школы і іх бацькі за гэта зносяць розныя кары дзяржаўнай фашысцкай улады.

ПРЫКЛАДУ РУРА ПАСЬЛЕДВАЛІ ГАРНЯКІ ВЕРХНЯЙ СІЛЕЗІІ

Утворан новы рэвалюцыйны профсаюз гарнякоў

25-га лютага міжнародны дзень барацьбы супроць беспрацоўя

БЭРЛІН, 14. Сёньня ў „Ротэ Фанэ“ апублікавана адозва за подпісам цэнтральных камітэтаў комуністычнай партыі Нямеччыны, Францыі, Ангельшчыны, Чэха-Славакіі і Польшчы, а таксама агульна-нямецкага камітэту рэволюцыйнай профопозыцыі Нямеччыны, бюро ўнітарнай конфэдэрацыі працы ва Францыі, кіраўніцтва руху меншасьці ў Ангельшчыне і кіраўніцтва чырвоных прафсаюзаў Чэха-Славакіі. Адозва гаворыць:—„З прычыны нячуванага росту беспрацоўя і масавай патрэбы ў гэтую зіму, мы зьвяртаемся да компартый, рэволюцыйных профорганізацый і ўсіх рэволюцыйных організацый капіталістычных краін з заклікам організаваць 25-га лютага міжнародны дзень барацьбы супроць беспрацоўя.

Масавая, магчыма больш шырокая мобілізацыя беспрацоўных, і ў першую чаргу мобілізацыя рабочых на прадпрыемствах за правядзеньне міжнароднага дня барацьбы супроць беспрацоўя 25-га лютага—усё гэта павінна быць ужыта зараз-жа, без правалокі. Пры гэтым уся ўвага павінна быць згуртавана на самых пільных патрэбах гэтай барацьбы, на патрабаваньнях непасрэдна зразумелых рабочым масам, на патрабаваньнях, пакрываючых патрэбы самых шырокіх рабочых мас. Папершае, неадкладная выдача часовай зімовай дапамогі кожнаму беспрацоўнаму. Па-другое, страхаваньне ад беспрацоўя ў памерах, адпавядаючы жыцьцёвым патрабаваньням рабочых, выключна за кошт прадпрыемцаў і дзяржавы. Па-трэцяе, вызваленьне беспрацоўных ад кватэрнай платы, падаткаў і аплаты комунальных паслуг. Па-чацьвертае, 7-мі гадзінны рабочы дзень і 6-ці гадзінны рабочы дзень на шкодных для здароўя вытворчасьцях. Забарона масавага звальненьня рабочых. Да гэтых агульных патрабаваньняў у кожнай паасобнай краіне павінны быць далучаны яшчэ і іншыя конкрэтныя лёзунгі дзейнічаньня, зьвязаныя з мясцовымі ўмовамі рабочага руху“.

„1931 год,—гаворыцца далей,—разглядаецца імпэрыялістычнымі ворагамі Савецкага Саюзу, як рашаючы год для ўсякага роду інтэрвэнцыяністскіх плянаў, бо гэты год будзе рашаючым у справе ажыцьцяўленьня вялікага пяцігадовага пляну соцыялістычнага будаўніцтва. Вось чаму рабочыя капіталістычных краін з вялікай увагай і энэргіяй павінны сачыць за ваеннымі падрыхтоўваньнямі імпэрыялістых, выкрываць іх і змагацца з імі.

У заключэньне ў адозьве гаворыцца:

„Адзіны выхад, [illegible]ковае вырашэньне пытаньня аб беспрацоўі—рэволюцыйная барацьба за нізрынуцьце капіталістычных урадаў, за заваёву ўлады пролетарыятам, за экспропрыяцыю экспропрыятараў.

Гэроічная барацьба гарнякоў Нямеччыны ня спынілася

БЭРЛІН, 14. Адначасова з стварэньнем чырвонага профсаюзу гарнякоў у Рурскай вобласьці і ў Верхняй Сілезіі, прыняла рашэньне аб стварэньні чырвонага профсаюзу гарнякоў і конфэрэнцыя дэлегатаў капальняў Заходня-Нямецкага вугальнага“ раёну Вурм. Конфэрэнцыя зьвярнулася да ўсіх гарнякоў раёну з заклікам напрудзіць усе сілы для таго, каб падрыхтаваць забастоўку супроць скарачаньня зарплаты.

32 прадпрыемствы ахоплены забастоўкай

БЭРЛІН, 14. Забастоўка тэкстыльных рабочых, якая працягваецца ўжо некалькі дзён у раёне правабярэжжа Рэйна і ахапіла 32 прадпрыемствы, працягваецца наперакор здрадніцтву рэформісцкіх профбюрократаў. Кіраўніцтва забастоўкай перашло да рэволюцыйнай профопозыцыі.

18 дывізія нанкінскіх войск перайшла на бок чырвоных

ШАНХАЙ, 14. 18 дывізія нанкінскіх войск, якая ваявала з чырвонай арміяй у провінцыі Цьзянсі, перайшла на бок чырвоных. Дзьве іншыя дывізіі акружаны часткамі чырвонай арміі. Па чутках, старшыня цьзянсійскага провінцыйнага ўраду Лю-Ці-Пін падаў у адстаўку ў зьвязку з няўдалай спробай задушыць комуністычны рух.

Прасьледваньні нямецкай нацменшасьці ў Польшчы

БЭРЛІН, 14. Сёньня выяжджае ў Жэневу нямецкая дэлегацыя на сэсію савету Лігі Нацый. Згодна паведамленьня „Фосішэ Цэйтунг“, нямецкія патрабаваньні па пытаньню аб прасьледваньнях нямецкай нацменшасьці ў Польшчы зводзяцца да таго, каб было забясьпечана поўнае правядзеньне ў жыцьцё складзенай пад протэктаратам Лігі Нацый умовы аб правох нацменшасьці.

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ ЗАДАЧ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ

Усебеларускі зьлёт 25-тысячнікаў, які сабраўся для падагульненьня вынікаў гадавой працы 25-тысячнікаў на соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і абгаварэньня практычных задач па падрыхтоўцы і правядзеньню надыходзячай вясеньняй пасеў-кампаніі, на сваім ранішнім паседжаньні 14 студзеня заслухаў даклад тав. Рачыцкага аб ходзе колектывізацыі, аб падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы і задачах 25-тысячнікаў.

Пасьля дакладу разгарнуліся шырокія спрэчкі, якія працягваліся ўвесь дзень.

Дэлегаты зьлёту ў спрэчках адзначылі шэраг недахопаў у сваёй працы, а таксама свае дасягненьні і перамогі.

25-тысячнікі, пераносячы вопыт соцыялістычнай прамысловасьці ў масы колгасьнікаў і аднаасобнікаў, дасягнулі значных посьпехаў.

Выступаўшыя ў спрэчках дэлегаты адзначалі недапушчальныя адносіны да колгасбудаўніцтва і працы колгасаў з боку Белкоопсаюзу і некаторых райколгассаюзаў.

Тав. Касой (колгас „Красавік“, Чачэрскага раёну) гаварыў (аб адсутнасьці конкрэтнага штодзённага кіраўніцтва з боку райколгассаюзу і райкому, аб тым, што іх кіраўніцтва выяўляецца толькі ў цыркулярах.

Дэлегат Веткаўскага р-ну, тав. Кульвінскі, расказваў зьлёту;

— У маі месяцы была зроблена заяўка на сані, але ў сьнежні месяцы прыслалі нам 25 калёс.

— Тав. Грышаеў (колгас імя Энгельса, Уваравіцкі р-н) гаворыць аб росьце колгасаў і павялічэньні колькасьці жывёлы.

— Колгас на працягу году набыў 360 цялят. Зараз колгас мае ўсяго 1273 штукі рагатай жывёлы. Будзе нястача загатаваных для жывёлы кармоў.

На нашы заявы аб гэтым не зьвяртаюць патрэбнай увагі.

Тав. Крылоў (Касцюковіцкі р-н) гаворыць аб невыстарчальным скарыстаньні трактароў. Запасных частак мала.

Астатнія таварышы, выступаўшыя ў спрэчках, таксама вялікую ўвагу ўдзялілі падрыхтоўцы да правядзеньня 2-ой бальшавіцкай вясны.

Ліквідавалі прарыў у сваёй рабоце

Петрыкаўская парткомсамольская організацыя гораду, пасьля зьмешчанага ў „Чырвонай Зьмене“ артыкулу аб дрэннай падрыхтоўцы перавыбараў гарсавету, зараз-жа правяла сходы партыйна-комсамольскіх ячэек. На сходах абгаварылі кандыдатуры ў новы склад гарсавету, утварылі брыгады ў дапамогу сельсавету па складаньню сьпісу выбаршчыкаў, разносцы і пісаньні позваў, маляваньню лёзунгаў і інш.

Петрыкаўская ШКМ організавала брыгаду з 15 чалавек у дапамогу сельсавету па выяўленьню малых дзяцей і організавалі сіламі вучняў дзіцячыя яслі. Разам з гэтым, вучні малодшых клясаў прымацаваны да пасобных дамоў з тым, каб у час перавыбарчых сходаў нагледаць за малымі дзецьмі.

Віктар Пінчук.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР— РЭДКОЛЕГІЯ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599